# «Я ніколі не згаджуся, калі меншасць ці большасць паводзіць сябе агрэсіўна»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Сёння Брэст, Баранавічы — галоўныя пункты новага шоўкавага шляху, а гэта вялікія грошы і патокі грузаў з Кітая ў Еўропу, цэнтры прыцягнення для стварэння інфармацыйнай інфраструктуры. «Сумесна з урадам вам неадкладна трэба заняцца мадэрнізацыяй рухомага саставу і транспартнай інфраструктуры вобласці, — даў даручэнне лідар краіны. — Кітай з Еўропай гандлююць праз нас. І мы гэтым павінны скарыстацца».

Задача ад кіраўніка краіны рэгіёну — аднавіць дарогі, у тым ліку трасу Брэст — Гомель. ***«Мы замахнуліся на будаўніцтва такой жа дарогі, якую мы пабудавалі на Гродна, Магілёў, Гомель, — чатырохпалоснай***. Нам трэба паўднёвы кірунак забраць, перахапіць усе патокі з Кітая, Казахстана праз поўдзень, Растоўскую вобласць, Валгаград і не цягнуць іх на трасу Брэст — Масква, а пусціць па поўдні і выйсці на Брэст, ці побач з Брэстам адкрыць яшчэ новы кантрольна-прапускны пункт і павялічыць нашу лагістыку», — акрэсліў Прэзідэнт планы на будучыню.

## Першы ў гісторыі мясцовы рэферэндум

Прэзідэнт паабяцаў правесці ў Брэсце рэферэндум наконт будучыні акумулятарнага завода. Пра гэта ён заявіў пасля нарады ў аблвыканкаме, размаўляючы з жыхарамі абласнога цэнтра, якія выступаюць супраць будаўніцтва акумулятарнага завода, і прадстаўнікамі мясцовай апазіцыі.

«***Мы прынялі рашэнне. Няхай вырашаць жыхары. Па акумулятарным як вырашыце, так і будзе. Я вам гэта гарантую і абяцаю***. Я займу нейтральную пазіцыю, арганізую рэферэндум. А вы — толькі без гвалту, без шуму. Вызначым месца, будзеце заклікаць людзей, дэбатаваць. Як на выбарах», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы паабяцаў асабіста пабываць на акумулятарным заводзе. Ён таксама запэўніў, што ў яго абсалютна нейтральная пазіцыя. З аднаго боку, завод патрэбен, ёсць рынкі збыту. Больш за тое, гэта імпартазамяшчэнне — адзін з асноўных кірункаў работы ў будучай пяцігодцы. З другога боку, калі людзі вырашаць, што завод не патрэбны ці яго трэба некуды перанесці, то, паводле слоў Прэзідэнта, гэта «не катастрофа». «Хутчэй за ўсё, мы знойдзем дзесьці месца, дзе можна пабудаваць, яшчэ экалагічна праштудзіраваць гэты завод, падчысціць, паглядзець, што за абсталяванне», — адзначыў ён.

Прэзідэнт паабяцаў, што рэферэндум пройдзе абсалютна адкрыта і празрыста, па тэрмінах яго лепш правесці пасля прэзідэнцкіх выбараў.

Аляксандр Лукашэнка не абышоў увагай і перадвыбарную тэму. Ён адзначыў, што сённяшнюю дэмакратыю вывучаў не па кніжках і чуе меркаванні ўсіх колаў грамадзян, нават невялікіх груп. ***«Ёсць большасць — яна ў асноўным заўсёды вырашае, але ёсць і меншасць, да якой трэба прыслухоўвацца. Таму я не лічу, што вамі трэба грэбаваць. І я тут не паддобрываюся пад вас і не стараюся вам ліслівіць. Я лічу, што любы чалавек мае права выказваць сваю пазіцыю. Але я ніколі не згаджуся, калі меншасць ці большасць паводзіць сябе агрэсіўна»***, — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Наконт будучых выбараў кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: ён не пойдзе ні на якую фальсіфікацыю. Ён у курсе ўсяго таго, што адбываецца на палітычным полі краіны, і таго, што пішуць пра яго, як часам называюць. У сувязі з гэтым ён заклікаў не пераходзіць на абразы. «Не трэба нас тузаць, абражаць, — папярэдзіў ён. — Я пакуль яшчэ дзеючы Прэзідэнт. Ні ў адной краіне не дазволена абражаць людзей. Я ж нікога з вас не абразіў асабіста. А калі хочаце рознага роду жуллё абараніць, вы абараняйце, але толькі не са мной. ***Карупцыянерам у краіне рабіць няма чаго»***, — падкрэсліў ён. У прыватнасці, беларускі лідар згадаў пра расследаванне, якое праводзіцца з нагоды вываду з краіны значных грашовых сум, адмывання грошай. «Мецэнат, карціны прывёз дзяржаве. А на паверку што выявілася? Гэта іх карціны. А чаму мы іх цяпер вымушаны былі прыхапіць? А таму, што яны пачалі канцы ў ваду хаваць, пачалі вывозіць грошы, карціны. Калі мы ў банк пайшлі, ведаеце, што знайшлі ў ячэйках? Грошы — гэта не галоўнае. Мы знайшлі флэшкі, дыскі і мора інфармацыі. І гэтага баяцца іх гаспадары», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заклікаў усіх аб'яднацца на карысць інтарэсаў краіны і пабудовы шчаслівай будучыні: «У вас ёсць дзеці. І ў мяне. Я хачу, каб яны жылі ў свабоднай, незалежнай краіне».

**Марыя ДАДАЛКА.**

# АРЭНДЫ ШМАТ НЕ БЫВАЕ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

— Пакуль заўчасна казаць, што гэта будуць за ўмовы. Магчыма, яны закрануць выдзяленне ўчасткаў зямлі або стварэнне інфраструктуры. Ці нешта трэба дапоўніць у Падатковым кодэксе, перагледзець падаткі. Не выключана, што ўнясём нейкія дапаўненні ва ўжо існуючыя нарматыўныя акты. Альбо гэта выйдзе нейкім самастойным дакументам, — расказаў начальнік упраўлення.

## У першую чаргу — для патрэбных работнікаў

Арэндным жыллём карыстаюцца тыя, хто знаходзіцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, і тыя, каму па рабоце неабходна даваць такое жыллё.

Выдзяляюцца арэндныя кватэры па заяўным прынцыпе. Інфармацыю пра наяўныя свабодныя метры размяшчаюць выканкамы, а зацікаўленыя падаюць заявы. Пры гэтым суіскальнікі не павінны мець ва ўласнасці жылля ў гэтым населеным пункце.

У цэлым жа квоты дзяржаўнага арэнднага жылля, прызначанага для тых ці іншых катэгорый грамадзян, вызначаны Жыллёвым кодэксам: 60 працэнтаў выдзяляецца для тых, хто стаіць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў па месцы жыхарства, 30 працэнтаў даецца першачарговым катэгорыям, а 10 працэнтаў прызначана для вайскоўцаў. Канкрэтна пад пэўную арганізацыю жыллё не даецца.

Напісаць заяву на выдзяленне арэнднага жылля могуць усе ахвотныя, але пры размеркаванні выканкамамі кватэр перавага аддаецца грамадзянам, якія маюць першачарговае права на арэнднае жыллё, пасля — тым, якія знаходзяцца ў агульнай чарзе маючых патрэбу на паляпшэнне жыллёвых умоў.

Згодна з пастановай Савета Міністраў ад 12 чэрвеня 2020 года № 339, устаноўлены катэгорыі бюджэтнікаў з першачарговым правам на атрыманне арэнднага жылля. У гэты спіс уваходзяць трэнеры-выкладчыкі па спорце спецыялізаваных вучэбна-спартыўных устаноў, сярэдніх школ-вучылішчаў алімпійскага рэзерву, трэнеры нацыянальных камандаў па розных відах спорту. На арэнднае жыллё ў першачарговым парадку таксама будуць прэтэндаваць медыцынскія, педагагічныя, творчыя работнікі, работнікі культуры, якія заключылі кантракт тэрмінам на пяць гадоў, у выпадку пацвярджэння патрэбы ў спецыялісце кіраўнікамі структурных падраздзяленняў аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама, гарадскіх, раённых выканкамаў, мясцовых адміністрацый раёнаў. Парадак пацвярджэння патрэбы ў спецыялістах вызначаецца аблвыканкамамі і Мінгарвыканкамам.

## Арэнда выгадная ўсім

Нават у абсалютна новых дамах Мінска арэнда двухпакаёвай кватэры абыходзіцца сям'і ў 300 рублёў у месяц, плюс камунальныя плацяжы. У цэлым летам выходзіць 350 рублёў, зімой — да 400 рублёў. Гэта як мінімум у паўтара раза танней, чым здымаць кватэру па камерцыйнай цане ў прыватнікаў. Ёсць у такога жылля і дадатковыя перавагі: пры выкананні элементарных умоў пражывання ў доме сям'ю ніхто нікуды не выганіць. А ў прыватніка ніхто не застрахаваны.

Паводле звестак спецыяліста, колькасць арэнднага жылля павялічваецца ў першую чаргу за кошт новага будаўніцтва.

— Мы гатовыя будаваць больш, але цяпер усё вызначаецца аб'ёмам выдзеленага фінансавання з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў. Думаю, не варта зацыклівацца толькі на дзяржаўных грошах. Будучыня — за прадпрыемствамі і арганізацыямі, якія стануць будаваць арэнднае жыллё для сваіх работнікаў, замацоўваючы такім чынам кадры, і прыватным капіталам. Цяпер мы працуем над прапановамі, якія дазволяць паскорыць гэты працэс, рыхтуем нарматыўны дакумент, каб удасканаліць механізм будаўніцтва такіх дамоў, — падзяліўся Аляксандр Аўраменка. Ён падкрэсліў: гэта выгадна, укладзенае акупіцца сто разоў. Па сутнасці, такое жыллё само сябе аднаўляе. Чым больш яго пабудавана, тым больш сродкаў ад арэнды назапашваецца на спецыяльных рахунках — яны выдаткоўваюцца як на тэхнічнае абслугоўванне дамоў, так і на будаўніцтва новых.

У Мінску за арэндную плату былі пабудаваны тры дамы на вуліцы Выгоцкага. Акрамя таго, фонд арэнднага жылля могуць папоўніць пустуючыя будынкі, якія ўжо існуюць: іх трэба толькі прывесці ў парадак і добраўпарадкаваць. Як прыклад — рэканструкцыя былога Дома быту пад шматкватэрнае жыллё ў горадзе Высокае Камянецкага раёна: і будынак выратавалі, і людзям ёсць дзе жыць.

## Уся справа ў грошах

Ці плануецца перагледзець план на год па будаўніцтве арэнднага жылля? Па словах Аляксандра Аўраменкі, зрабіць гэта дастаткова складана.

— Гэта ж датычыцца бюджэтнага фінансавання, і перагледзець планы вельмі складана, на гэта трэба знайсці грошы. Калі ў дзяржавы будуць дадатковыя крыніцы фінансавання менавіта з бюджэту, наша галіна гатовая пабудаваць больш арэнднага жылля, — падкрэсліў прадстаўнік міністэрства.

А пакуль больш за ўсё арэндных дамоў маюць намер узвесці ў Мінскай вобласці — 30,5 тысячы квадратных метраў. У Брэсцкай — 25,4 тысячы «квадратаў», у Гомельскай — 16,3 тысячы, у Магілёўскай — 14,84 тысячы, у Гродзенскай — 13,88 тысячы, у Віцебскай — 11,78 тысяч і ў Мінску — 22,3 тысячы квадратных метраў.

Што датычыцца магчымасці прыватызацыі арэнднага жылля ў будучыні, то заканадаўствам падобнае пакуль не прадугледжана.

## Мінск можа павялічыць будаўніцтва «арэнды» ў разы

Галоўны інжынер акцыянернага таварыства «МАПІД» Аляксей Маслаў адзначае, што сёння гэтая арганізацыя вырабляе домакамплекты буйнапанэльнага домабудавання, якія дазваляюць узводзіць каля 270 тысяч квадратных метраў жылля ў год. Але гэта не мяжа. Калі б у вытворцы былі рэальныя буйныя заяўкі на выраб камплектаў масавых серый, то МАПІД павялічыў бы сваю магутнасць да 400 тысяч квадратных метраў у год.

У прыватнасці, на думку спецыяліста, магчыма будаўніцтва бюджэтных дзевяціпавярховых дамоў 464-й серыі. Дамы гэтай серыі дазваляюць дасягаць нізкага сабекошту квадратнага метра жылля — ад 1050 да 1400 рублёў. Галоўнае — знайсці першапачатковы стартавы капітал.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Тэхналогіі будучыні

# Сусветная нанарэвалюцыя. Як не адстаць ад лідараў?

**«З нанатэхналогіямі звязваюць пяты і шосты тэхналагічны ўклады: гэта перадавы край навукі, які можа вывесці нас на новы ўзровень», — такую думку выказаў на сустрэчы з журналістамі першы намеснік старшыні Прэзідыума НАН Беларусі, акадэмік Сяргей ЧЫЖЫК.**

— Нанаіндустрыю як асобную галіну разглядаць праблематычна, — падкрэсліў ён. — «Нана» пранікае практычна ва ўсе сферы: медыцыну, біятэхналогіі, сучасную электроніку, вытворчасць пакрыццяў і матэрыялаў... Магутнасці, якімі валодаюць сучасныя мабільныя тэлефоны, сталі магчымыя толькі дзякуючы таму, што мы выходзім на нанамаштаб. Лідары ў гэтай галіне заяўляюць, што тэхналагічны працэс складае ўжо менш за 10 нанаметраў. Таму тыя прадпрыемствы і вытворцы, якія хочуць заставацца канкурэнтаздольнымі, вядуць цяпер пошук у нанамаштабе. Гэта цяжкадаступны ўзровень: для таго каб на яго выйсці, патрабуюцца спецыяльна падрыхтаваныя кадры і складанае абсталяванне. Каранавірус, дарэчы, — таксама нанаб'ект памерам арыенціровачна 100 нанаметраў, таму пасля ПЦР-аналізу можна толькі ўскосна вызначыць яго прысутнасць у клетцы.

Новыя тэхналогіі патрабуюць вялікіх укладанняў, але яны даюць адчувальны вынік. У 2013 годзе ў Беларусі была створана Рэспубліканская асацыяцыя нанаіндустрыі, якая аб'яднала каля 30 арганізацый рознай формы ўласнасці (акадэмічныя структуры, ВНУ, прамысловыя прадпрыемствы) у сем кластараў. Сярод іх, напрыклад, кластар прэцызійнай нанапамернай апрацоўкі. Па словах Сяргея Чыжыка, у гэтым кірунку атрымалася дасягнуць унікальных вынікаў па стварэнні звышгладкіх паверхняў, запатрабаваных у першую чаргу ў оптыцы. Узровень гладкасці — атамарны, перапады няроўнасці паверхні складаюць менш чым адзін нанаметр.

У сваю чаргу, Цэнтр нанадыягностыкі і скануючых зондавых тэхналогій арыентуецца на стварэнне абсталявання, якое дазваляе праводзіць дыягностыку ў нанамаштабе. Яго выкарыстоўваюць у электроніцы, у матэрыялазнаўчых лабараторыях, прамысловасці, а таксама ў медыцыне. З дапамогай такіх прыбораў можна вызначыць паталогіі на клетачным узроўні. Увогуле большасць захворванняў з'яўляецца наступствамі збояў у арганізме на малекулярным узроўні — гэта значыць, на тым узроўні, на якім дзейнічаюць нанатэхналогіі.

Акрамя таго, у нашай краіне сфарміраваўся кірунак па распрацоўцы нанавугляродных матэрыялаў. У Цэнтры НАН Беларусі па матэрыялазнаўстве знойдзены новыя недарагія шляхі па атрыманні звышлёгкага нанаструктурнага графенападобнага матэрыялу. Нанаструктурныя матэрыялы ўжываюцца таксама ў вытворчасці палімераў, фарбаў, для павышэння трываласці бетону. Утварыўся і кластар па магнітных нанаматэрыялах і пакрыццях. Дзякуючы яму ствараюць унікальныя электрамагнітныя ахоўныя экраны.

— Пры пераходзе з мікра- на нанаўзровень многія матэрыялы могуць кардынальна змяняць свае ўласцівасці — напрыклад, тыя, што не праводзілі электрычнасць, становяцца амаль ідэальнымі праваднікамі. Назіраецца і шэраг іншых цікавых эфектаў, — расказвае **выканаўчы дырэктар Рэспубліканскай асацыяцыі нанаіндустрыі, вядучы навуковы супрацоўнік Навукова-практычнага цэнтра НАН па матэрыялазнаўстве Аляксей ТРУХАНАЎ**. — Эфектыўнасць нанаструктурных матэрыялаў вызначаецца іх шматфункцыянальнасцю, магчымасцю рэалізацыі ўнікальнага спалучэння ўласцівасцяў, недасягальнага для традыцыйных матэрыялаў.

Цікавасць да вынікаў фундаментальных і прыкладных даследаванняў у галіне нанатэхналогій і нанаматэрыялаў з боку прамысловасці і бізнесу пастаянна павялічваецца. Гэта абумоўлена магчымасцю распрацоўкі і ўкаранення матэрыялаў з якасна новымі ўласцівасцямі, развіццём новых эканамічна эфектыўных тэхналагічных прыёмаў і метадаў, укараненнем сучасных прыбораў і метадаў даследавання нанаматэрыялаў і нанаструктур.

Мікраэлектроніка апошнія дзесяцігоддзі вылучалася высокімі тэмпамі развіцця, абумоўленымі здольнасцю пастаянна скарачаць мінімальны памер кампанентаў інтэгральных мікрасхем.

Увогуле сусветны рынак сёння больш чым на 40 працэнтаў складаецца з прадукцыі трох асноўных тэхналогій XXI стагоддзя. Гэта IT-тэхналогіі, біятэхналогіі і нанатэхналогіі. І іх доля будзе павялічвацца. Дарэчы, тыя гіганты, якія не змаглі хутка перабудавацца, саступілі свае пазіцыі на рынку — напрыклад, такія кампаніі, як Siemens і Nokia. Аб'ём рынку нанаматэрыялаў і нанапаслуг на Захадзе вымяраецца сотнямі мільярдаў долараў.

— Многія выступаюць за больш глыбокае пранікненне нанатэхналогій у рэальны сектар, але гэта рызыкоўны варыянт, — лічыць Сяргей Чыжык. — Нанатэхналогіі ў масавай вытворчасці могуць аказацца неэфектыўнымі, бо чым буйнейшая вытворчасць, тым складаней наладзіць кантроль. Большы поспех у гэтай галіне можна чакаць ад малых прадпрыемстваў.

Пры гэтым у краіне ёсць прыклады паспяховага прымянення нанатэхналогій і на буйных прадпрыемствах: «Планар», «Пеленг», «Інтэграл»...

Многія краіны ўключыліся сёння ў гонку па распрацоўцы новых матэрыялаў, каб не ўпусціць глабальнага тэхналагічнага лідарства. Адным з наймагутнейшых драйвераў апошніх дзесяцігоддзяў было імкненне атрымаць максімальны эфект пры мінімальных затратах рэсурсаў. І калі пры выкарыстанні традыцыйных матэрыялаў людзі дасягнулі пэўных меж, то нанамадыфікаваныя матэрыялы дазваляюць зрабіць якасны скачок у пошуках адказаў на глабальныя выклікі, якія паўстаюць перад чалавецтвам. А безумоўнымі лідарамі ў сферы нанатэхналогій з'яўляюцца ЗША, Японія, краіны Еўрасаюза. Актыўна пашыраюць даследаванні і распрацоўкі ў гэтым кірунку Кітай, Паўднёвая Карэя, Расія, Індыя, Бразілія.

**Найважнейшай задачай у наступныя 10—20 гадоў, на думку большасці экспертаў, стане распрацоўка матэрыялаў для медыцыны. Чакаецца, што за гэтыя гады будуць створаны нанаматэрыялы для мэтавай дастаўкі лекаў, «разумных» імплантатаў і штучных органаў, для інтэрфейсу электронных прылад, якія ўжыўляюцца ў чалавечыя органы.**

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Спажывец

# ПАКУПКІ НА КАНАПЕ

### Эксперты адзначаюць, што вірус COVID-19 змяніў стаўленне людзей да інтэрнэт-гандлю

**Раней штогадовы рост рынку электроннай камерцыі складаў у сярэднім 10 %. Аднак пандэмія змяніла пакупніцкія звычкі беларусаў і сфарміравала новую мадэль спажывання і шопінгу. Паводле прагнозаў сусветных экспертаў, падчас другой хвалі актыўнасці віруса, магчымай бягучай восенню, людзі працягнуць захоўваць дыстанцыяванне ў знешніх кантактах і такім чынам падвояць сваю прысутнасць у анлайн-крамах.**

## Красавік—май — першы скачок, пачатак восені — другі

Сышоўшы ў рэжым самаізаляцыі, мы сталі траціць у інтэрнэце значна больш. Адбыўся значны рост анлайн-плацяжоў у наступных сегментах: прадукты харчавання, медыцынскія тавары, бытавая тэхніка і электроніка, тавары для жывёл, дзіцячыя тавары. Сёння з упэўненасцю можна сказаць, што эпідэміялагічная сітуацыя сцірае існуючыя бар'еры — як псіхалагічныя, такія як боязь кібермахлярства, так і заканадаўчага плана — лекі зараз можна купіць анлайн.

— Цяпер рынак e-commerce трохі запаволіў свой бурны рост, — каментуе сітуацыю **дырэктар правайдара электронных плацяжоў на рынку Беларусі кампаніі АСІСТ Вячаслаў СЕНІН**. — У канцы сакавіка бягучага года мы назіралі ўсплёск так званых стрэсавых пакупак кліентаў. Гэта былі доўгія пералікі найменняў прадуктаў: макарона, крупы, кансервы, дзіцячыя тавары, а таксама антысептыкі і іншыя ахоўныя сродкі. Да канца красавіка адбыўся скачок сезонных тавараў. Папулярныя сталі тавары для дачы, інструменты, а таксама адзенне, абутак і іншае. Бліжэй да восені надыдзе новы сезон — падрыхтоўкі дзяцей да школы, і мы ўбачым рост у іншых сегментах. Але важным момантам бягучага года на рынку электроннага гандлю застаецца трэнд «перацякання» ў мабільны канал і павелічэнне аб'ёму абаротаў у анлайн-гандлі.

Разам з рынкам электроннага гандлю працягнецца і рост якасці плацежных тэхналогій. Міжнародныя плацежныя сістэмы стымулююць банкі прасоўваць бескантактавыя плацяжы. Адбываецца паэтапная замена плацежных картак на новыя з функцыяй бескантакту, з'яўляюцца «фанавыя» навінкі ў выглядзе плацежных кольцаў, бранзалетаў і іншых гаджэтаў. Таксама падчас пандэміі павялічыліся ліміты бескантактавых плацяжоў для рынку нашай краіны. Напрыклад, Visa павысіла такі ліміт да 120 рублёў (было 80).

## Хуткасць дастаўкі і бяспека

— Нашы партнёры адзначаюць, што галоўнай прычынай росту анлайн-пакупак, акрамя бягучай сітуацыі і шырэйшага асартыменту тавараў, чым у афлайне, лічыцца павышаны ўзровень бяспекі правядзення электронных плацяжоў, — адзначыў Вячаслаў Сенін.

Ён перакананы, што канкурэнцыя на анлайн-рынку будзе ўзрастаць і галоўны спосаб перасягнуць канкурэнта — павысіць хуткасць і якасць выканання заказаў. Міжнародныя буйныя гульцы інвестуюць ва ўласныя сістэмы дастаўкі — напрыклад, гэта робіць Amazon. Прадаўцы пачнуць спаборнічаць па хуткасці і мінімізацыі кошту дастаўкі. Мабільныя прылады — ключавая платформа для лічбавага кантэнту, і гэтая тэндэнцыя з часам толькі ўзмоцніцца.

**Сяргей КУРКАЧ.**

75 мірных гадоў. Беларусь памятае!

# СТАРОНКІ ПРАЎДЫ І БОЛЮ

**У Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» прадставіла новыя кнігі серыі «Беларусь. Трагедыя і праўда памяці».**




Праект пачынаўся ў 2018 годзе як асобная кніга да 75-годдзя хатынскай трагедыі, але ў выніку выліўся ў цэлую кніжную серыю, прысвечаную самым страшным старонкам Вялікай Айчыннай вайны. Аформленыя ў выглядзе «чорных квадратаў памяці», кнігі на рускай, беларускай і англійскай мовах расказваюць шырокай аўдыторыі пра злачынствы нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Беларусі: Хатынь, Трасцянец, Навагрудак, Масюкоўшчына, Азарычы і многія іншыя месцы масавага знішчэння людзей, ваеннапалонных, мірных жыхароў, партызан і падпольшчыкаў...

За кожным выданнем — архіўныя дакументы і занатаваныя ўспаміны відавочцаў тых страшных падзей, грунтоўная даследчая работа мясцовых краязнаўцаў, прафесійных вучоных-гісторыкаў, пошукавых атрадаў, якая часта доўжылася не адзін год і нават дзесяцігоддзе. Так, аўтар новай кнігі «Асіповічы» краязнаўца і настаўніца гісторыі Неаніла Цыганок добрых 15 гадоў разам са сваімі вучнямі займалася пошукавай работай, па драбніцах збіраючы звесткі, — дзякуючы гэтай працы 176 імён загінулых сёлета абнародаваныя ўпершыню.

Нават праз 79 гадоў з пачатку Вялікай Айчыннай вайны вельмі важна захоўваць праз памяць сувязь пакаленняў і шырока папулярызаваць гісторыю, каб ніхто не меў магчымасці яе перапісаць на новы лад, падкрэсліваюць удзельнікі выдавецкага праекта — навукоўцы, даследчыкі, прадстаўнікі музеяў і мемарыяльных комплексаў. Загадчыца аддзела навукова-даследчай работы Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Наталля Яцкевіч расказала, у прыватнасці, што практычна кожны тыдзень музей атрымлівае ад беларусаў, жыхароў постсавецкіх і замежных краін запыты пра лагер ваеннапалонных у Масюкоўшчыне: людзі не губляюць надзеі ўстанавіць месца гібелі і ўшанаваць памяць сваіх дзядоў і прадзедаў. Нядаўна, напрыклад, грамадзянін Італіі даслаў электронныя копіі лістоў свайго дзеда са штэмпелем «Шталаг 352» — і цяпер мы ведаем яшчэ адно прозвішча з прыблізна пяці тысяч італьянскіх ваеннапалонных, якія загінулі ў канцлагеры Масюкоўшчына.

«Гісторыю трэба помніць і захоўваць, каб жыць і развівацца далей. Таму, безумоўна, серыя будзе працягвацца», — зазначае **кіраўнік выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Вольга ВАНІНА**. У цяперашні час працягваецца збор матэрыялаў па Магілёўскай і Віцебскай абласцях, па Брэсцкім гета, па дзіцячым канцлагеры «Чырвоны Бераг» — на жаль, «чорных квадратаў памяці» і нявыяўленых пахаванняў воінаў і ахвяр Вялікай Айчыннай вайны на беларускай зямлі яшчэ вельмі многа...

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Вышэйшая школа

# ЯКАСЦЬ АДУКАЦЫІ БУДЗЕ КАНТРАЛЯВАЦЬ НАЦЫЯНАЛЬНАЕ АГЕНЦТВА

**23 чэрвеня ў Міністэрстве адукацыі ў анлайн-фармаце адбылося афіцыйнае падпісанне пагаднення аб пазыцы (праект «Мадэрнізацыя вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь») паміж Рэспублікай Беларусь і Міжнародным банкам рэканструкцыі і развіцця.**

У адпаведнасці з падпісаным дакументам Міжнародны банк рэканструкцыі і развіцця ў 2020—2025 гадах выдасць Беларусі пазыку ў памеры 100 мільёнаў еўра на мадэрнізацыю вышэйшай адукацыі, у тым ліку на стварэнне і мадэрнізацыю сучаснага вучэбна-адукацыйнага асяроддзя ў ВНУ, укараненне інавацыйных падыходаў, тэхналогій навучання і выкладання, а таксама пашырэнне пераўтварэнняў у сферы кіравання і забеспячэння якасці адукацыі.

У рамках рэалізацыі Пагаднення аб пазыцы плануецца стварыць на базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта міждысцыплінарны вучэбна-даследчы цэнтр, які ўключыць у сябе 37 навучальных лабараторый, дзевяць цэнтраў калектыўнага карыстання, мадэрнізаваць больш за 60 вучэбна-даследчых лабараторый. Таксама запланаваны капітальны рамонт асобных навучальных карпусоў ВНУ са стварэннем неабходнай інфраструктуры і павышэннем энергаэфектыўнасці будынкаў. Названыя мерапрыемствы будуць рэалізаваны ў 18 установах вышэйшай адукацыі (у тым ліку ў дзесяці рэгіянальных), падпарадкаваных міністэрствам адукацыі, аховы здароўя, транспарту і камунікацый, сельскай гаспадаркі і харчавання.

Акрамя таго, у рамках праекта будзе створана Нацыянальнае агенцтва па забеспячэнні якасці адукацыі (на ўсіх узроўнях адукацыі).

Рэалізацыя праекта «Мадэрнізацыя вышэйшай адукацыі» дасць магчымасць сфарміраваць у беларускіх універсітэтах інтэграванае інавацыйнае асяроддзе, якое забяспечыць падрыхтоўку і выпуск канкурэнтаздольных спецыялістаў, арганізаваць навучанне па шэрагу перспектыўных спецыяльнасцяў (такіх як біяінжынерыя, нанахімія, сінтэтычная і сістэмная біялогія, фармакалогія, біяінфарматыка, біямеханіка, феноміка, геноміка і іншыя), забяспечыць развіццё сеткавай формы ўзаемадзеяння, будзе спрыяць павышэнню экспарту адукацыйных паслуг. Акрамя таго, створаная інфраструктура дазволіць забяспечыць падтрымку рэалізацыі канцэпцыі «Універсітэт 3.0», паспрыяе міждысцыплінарным навукаёмістым распрацоўкам, іх камерцыялізацыі, стварэнню на базе ўстаноў вышэйшай адукацыі інавацыйных кампаній і іх рэгістрацыі ў якасці рэзідэнтаў тэхнапаркаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**